# НАЦЫЯНАЛЬНЫЯ І ЭТЫЧНЫЯ ІДЭАЛЫ І КАШТОЎНАСЦІ Ў КУЛЬТУРАЛАГІЧНАЙ ДУМЦЫ

**С. В. Снапкоўская**
Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт,
факультэт сацыякультурных камунікацый,
ул. Курчатава 5, 220108,
Мінск, Рэспубліка Беларусь
e-mail: ssvet88@inbox.ru

У артыкуле разглядаюцца такія ключавыя этычныя паняцці, як дабро, справядлівасць, годнасць і мужнасць, абавязак і адказнасць, існіна і праўда, сумленне і свабода. Раскрываюцца адносіны агульначалавечых і нацыянальнах ідэалаў і каштоўнасцей у сферы культуры, адукацыі і выхавання. Аўтарам раскрываюцца асноўныя этапы эвалюцыі паняццяў «ідэал» і «каштоўнасць» у культуралагічнай думцы.

*Ключавыя словы*: маральныя ідэалы і каштоўнасці, грамадская свядомасць, выхаванне пачуцця доўгу і адказнасці за сябе і іншых, нацыянальныя каштоўнасці ў сферы духоўнай культуры.

# NATIONAL AND ETHICAL IDEALS AND VALUES IN CULTUROLOGICAL THOUGHT

**S. V. Snapkovskaia**
Belarusian State University, Sociocultural Communications Department,
Kurchatov St. 5, 220108, Minsk, Republic of Belarus
e-mail: ssvet88@inbox.ru

The article depicts key ethical notions such as goodness, justice, dignity and courage, duty and responsibility, truth and verity, conscience and freedom. The relationship between the universal and national ideals and values in the field of culture and education is considered. The auv thor reveals the main stages of the evolution of the notions «ideal» and «value» in culturological thought.

*Key words:*moral ideals and values, social awareness, education of the sense of duty and responsibility for yourself and others, national values in the sphere of humanitarian culture.

На рубяжы XIX—XX стст. значнае месца ў культуры паступова пачынаюць займаць нацыянальныя і этычныя ідэалы, якія прадугледжвалі забеспячэнне дэмакратычных правоў народа, свабоднае развіццё нацыянальнай культуры. У гэты час паняцце «ідэал» суаднасіц-

ца з «каштоўнасцямі», якія даследуюцца аксіялогіяй. У гэты перыяд у культур-філасофскай думцы Беларусі паняцце «ідэал» разумеецца як дасканаласць, дасканалы ўзор якога-небудзь аб'екта, з'явы, падзеі з пункту гледжання канкрэтнага чалавека ці групы людзей. У прыватнасці, у сярэдневяковай культуры Беларусі на прыкладзе асветніцкай дзейнасці Еўфрасінні Полацкай і Кірылы Тураўскага яскрава выявіліся ідэалы боскай мудрасці і грамадскай згоды. У эпоху Адраджэння сфарміраваўся гуманістычны ідэал асветніка, а разам з тым і ўнікальная канцэпцыя Ф. Скарыны «паспалітае добрае».

М. Крукоўскі ў кнізе «Бляск і трагедыя ідэалу» вылучае пэўную іерархію ідэалаў, суб'ектыўныя структурныя ўзроўні ідэалаў грамадства, дзе ёсць месца ідэі боскай наканаванасці, прыродаадпаведнасці чалавека, нацыянальнай беларускай ідэі, класавай салідарнасці, прафесійнай годнасці, сямейнай дабрачыннасці, асабіста-маральнай годнасці [6].

З мэтай выяўлення сучасных і актуальных у нашых умовах ідэалаў М. Крукоўскі робіць экскурс у філасофію паняцця гэтага тэрміну, шукае яго ў гісторыі філасофіі і разглядае ідэал як філасофскую праблему, вылучае яго аб'ектыўна-суб'ектыўную прыроду. М. Крукоўскі перакананы, што паняцце ідэалу існуе не толькі ў духоўным, але і ў мастацкім, і нават у матэрыяльным пластах культуры як цэласнай універсальнай сістэмы. Пры гэтым найбольш яскрава паказвае сябе ідэальнасць і сам ідэал на ўзроўні мастацкай культуры. На думку вучонага, «мастацкая культура — гэта даўняя сфера дзейнасці ідэалу, дзе ён атрымаў і сваё баявое хрышчэнне як самастойны навукова-філасофскі тэрмін» [7, с. 72]. М. Крукоўскі вылучае нацыю як пэўную сацыяльную норму і адпаведны ёй ідэал. Такім чынам, на гэтым узроўні ідэальнае мае сабе дакладны матэрыяльны адпаведнік у форме мовы, якая «ў адзінстве са свядомасцю як ідэальным пачаткам утварае найбольш рэальнае існаванне гэтай свядомасці. І не толькі мовы, але і ўсёй нацыянальнай культуры» [7, с. 22].

Акрэсліваючы структурную аснову ідэала, вучоны адзначае, што «жывая прырода і космас, нягледзячы нават на шырыню і непараўнаную з чалавекам аб'ёмнасць, займаюць у нашай іерархічнай сістэме месца, ніжэйшае па сваёй духоўнай арганізаванасці за чалавека. Таму Бог у якасці вышэйшай, абсалютнай для чалавека меры ідэальнасці выступае як структура структур і, адпаведна, як ідэал ідэалаў. А чалавек — як прадукт Боскага стварэння ў самым шырокім сэнсе гэтага багаслоўскага тэрміна» [7].

Пры гэтым маральнасць з'яўляецца адным са спосабаў нарматыўнага рэгулявання паводзін чалавека, адмысловай формай грамадскай свядомасці і відам грамадскіх адносін. Больш за тое, маральныя прынцыпы маюць усеагульнае значэнне, ахопліваюць усё чалавецтва, замацоўваюць асновы культуры іх узаемаадносін, створаныя ў працэсе гістарычнага развіцця грамадства.

А. Лапцёнак мяркуе, што сістэма каштоўнасцей, зыходзячы з зададзенай ролі маралі як сродку дасягнення якіх-небудзь мэт, набывае выгляд, які вызначаецца рэальнай сацыякультурнай дамінантай, як правіла, палітычнай, рэлігійнай ці нацыянальнай [5, с. 14]. Пры гэтым асобасны ўзор у межах традыцыйнай маралі вынікае з сістэмы адносін чалавека і грамадства.

Роля маральных каштоўнасцей ва ўмовах традыцыйнага грамадства зводзіцца, у асноўным, да стабілізацыі аксіялагічнай сістэмы і арыентавана, у першую чаргу, на бесперапынную трансляцыю маральных каштоўнасцей. Пры гэтым улічваецца непасрэднае ўздзеянне традыцыйнай культуры на індывіда, што стварае цэлы спектр адносін маральнай свядомасці.

Сярод асноўных катэгорый маральнасці вылучым паняцці дабра, справядлівасці, годнасці і мужнасці, абавязку і адказнасці, ісціны і праўды, сумлення і свабоды. На думку М. Крукоўскага, катэгорыя дабра з'яўляецца асноўнай катэгорыяй этыкі. Прадметам жа апошняй з'яўляецца мараль, што таксама ўваходзіць у сістэму культуры ў якасці вельмі істотнай састаўной яе часткі. Таму катэгорыя дабра з неабходнасцю з'яўляецца і агульна-культуралагічнай катэгорыяй. Такім чынам, калі мараль і дабро маюць пераважна духоўны характар, то застаецца высветліць, якая ўзаемасувязь злучае іх з асноўнай катэгорыяй духоўнай культуры — ісцінай. Паводле М. Крукоўскага, калі ісціна і дабро ўтвараюць своеасаблівае адзінства, дзе ісціна як бы звернутая да аб'екта, а дабро — да суб'екта, то яны могуць упісацца ў траістую сістэму суб'ектна-аб'ектнай каштоўнаснай адносіны з трыма асноўнымі культуралагічнымі катэгорыямі — ісціны, прыгажосці і карысці.

З якой бы філасофска-светапогляднай пазіцыі ні разглядалася ісціна, нязменным застаецца адно — яе разумовы характар, незалежна ад таго, трансцэндэнтны ён ці чалавечы. Паняцце дабра з'яўляецца катэгорыяй этыкі, якая аб'ядноўвае ўсё, што мае станоўчае маральнае значэнне, якое адказвае асноўным патрабаванням маральнасці, процістаіць злу. У сваю чаргу паняцце справядлівасці

азначае такі стан рэчаў, што адказвае ўяўленням пра сутнасць чалавека, яго неадʼемныя правы, прызнае роўнасць паміж усімі людзьмі і неабходнасць суадноснасці паміж іх правамі і абавязкамі, заслугамі і прызнаннем.

Не менш важная і такая катэгорыя этыкі, як сумленне, што характарызуе здольнасць чалавека ажыццяўляць маральны самакантроль, унутраную самаацэнку з пазіцый адпаведнасці сваіх паводзін патрабаванням маральнасці, самастойна фармуляваць для сябе этычныя задачы і патрабаваць ад сябе іх выканання. Пры гэтым сумленне лічыцца субʼектыўным усведамленнем асобай свайго абавязку і адказнасці перад грамадствам, іншымі людзьмі.

Годнасць азначае адметнае маральнае стаўленне чалавека да самога сябе і стаўленне да яго з боку навакольнага грамадства, заснаванае на прызнанні каштоўнасці чалавека як асобы. Паняцце годнасці асобы абапіраецца на прынцып роўнасці ўсіх людзей у этычным плане, засноўваецца на роўным праве кожнага чалавека на павагу, незалежна ад таго, якое сацыяльнае становішча ён займае. У працах беларускіх народнікаў годнасць даволі часта суадносіцца з паняццем мужнасці.

Абавязак — катэгорыя этыкі, якая азначае стаўленне асобы да грамадства, іншых людзей, што выяўляецца ў маральным абавязку ў адносінах да іх у пэўных умовах. Абавязак уяўляе сабой маральную задачу, якую чалавек фармулюе для сябе сам на падставе этычных патрабаванняў, звернутых да грамадства.

У агульным рэчышчы сусветнай культуры філасофская спадчына рускіх мысліцеляў і вучоных XX ст. змяшчае важныя тэарэтычныя дасягненні, на якіх варта спыніцца асобна. У цэнтры ўвагі рускіх філосафаў стаяць чалавек, асоба і яе адносіны да духоўных каштоўнасцей, якія існуюць у імя гэтай асобы і толькі пры гэтых умовах выступаюць як сапраўды агульначалавечыя і нацыянальныя каштоўнасці.

Праблемы сістэматызацыі прыярытэтных нацыянальных каштоўнасцей у працах рускіх філосафаў неабходна разглядаць зыходзячы з метадалагічных падыходаў да ацэнкі быцця і фарміравання чалавечай асобы. Іх багатая спадчына доўгі час была выключана з інтэлектуальнага патэнцыялу савецкага грамадства ці падвяргалася адмоўнай крытыцы. Аднак у творчым арсенале іх змяшчаецца шэраг ідэй і высноў, якія ўяўляюць актуальнасць і інтарэс для навукоўцаў. Гэта, у першую чаргу, адносіцца да іх трактоўкі агульначалавечых і нацыянальных каштоўнасцей у сферы духоўнай культуры.

Так, В. Зяньковскі сцвярджаў, што ў цэнтры рускай філасофіі, усіх яе пошукаў з даўніх часоў стаіць чалавек [4, с. 19].

Менавіта на асобу чалавека і арыентавана канцэпцыя рускіх філосафаў. М. Бярдзяеў падкрэсліваў, што чалавек у сваёй паўнаце ёсць і космас, і асоба. Ён пісаў, што «<...> у цэнтры свету стаіць чалавек і лёс чалавека вызначае лёс свету, праз яго і для яго» [1, с. 140]. Бярдзяеў паказаў унікальнасць чалавечай асобы, яе таямніцы, яе адзінкавасць, яе «незразуметасць». Ён сцвярджаў: «Таямніца асобы нікому не зразумела да канца. Асоба чалавечая больш таямнічая за сусвет. Яна і ёсць цэлы сусвет. Чалавек — мікракосм і заключае ў сябе ўсё» [1, с. 140].

На думку філосафа, фарміраванне новага чалавека менавіта як вышэйшай каштоўнасці не можа ажыццяўляцца ні пры капіталізме, ні пры сацыялізме, бо ў межах пэўнага сацыяльнага ладу ў чалавека толькі адна функцыя: функцыя эканомікі. Адначасова ён быў перакананы, што фарміраванне новага чалавека, выхаванне яго маральных якасцей не звязана з новай арыентацыяй грамадства, якую ўяўляе сабой савецкая ўлада. Гэта праблема павінна знайсці рашэнне ў новай душэўнай структуры чалавека. Яна прадугледжвае яго духоўнае перавыхаванне. Бярдзяеў зыходзіць з думкі, што дух сілы можа быць толькі ў грамадстве, дзе галоўнай аксіялагічнай катэгорыяй выступае асоба. Ён пісаў, што новы чалавек можа з'явіцца толькі ў тым выпадку, калі чалавека лічаць вышэйшай каштоўнасцю. Калі чалавека разглядаць выключна як цагліну для будаўніцтва грамадства, калі ён толькі сродак для эканамічнага прагрэсу, то варта казаць не столькі пра з'яўленне новага чалавека, колькі пра яго знікненне. Гэта значыць пра паглыбленне працэсу дэгуманізацыі.

Кардынальнай аксіялагічнай катэгорыяй у трактоўцы прадстаўнікоў дадзенага філасофскага напрамку выступае Асоба як нешта ўнікальнае. У святле гэтых гуманістычных каштоўнасцей расійскія філосафы канца XIX—пачатку XX ст. распрацоўвалі духоўныя прыярытэты ў працэсе фарміравання асобы. Істотны ўклад у разуменне асобы як каштоўнаснай катэгорыі культурна-адукацыйнага працэсу ўнёс В. Розанаў. Філосаф вызначаў чалавека як цэласную з'яву, якую нельга ацэньваць па частках, а неабходна разглядаць у пэўным адзінстве, у гармоніі з самім сабой, гэта значыць комплексна [8, с. 229]. Так, адной са стрыжнявых асноў яе павінен з'яўляцца шырокі антрапалагічны падыход, які можа ажыццяўляцца праз комплекс узаемазвязаных навук аб чалавеку (псіхалогія, філасофія, фізіялогія).

У сістэме духоўных каштоўнасцей гуманістычнай сферы рускія філосафы асобна выдзялялі ідэю свабоды асобы і разглядалі яе як неабходную ўмову фарміравання цэласнай гуманістычнай асобы. Так, В. Салаўёў сцвярджаў, што асоба павінна быць салідарна з усімі. Ён падкрэсліваў думку аб «узаемнай любові» і «агульнай любові» [9, с. 231]. Ён пісаў: дасканалы чалавек ёсць той, які, валодаючы поўнай сілай і энергіяй чалавечага пачатку, сам дабравольна і безумоўна падпарадкоўвае ўсё чалавечае ў сабе вышэйшай боскасці. «Ідэя яднання чалавека з Богам непарыўна звязана ў філосафа з паняццем рэлігійнай ісціны. У яго разуменні абсалютная ісціна гэта царква, дзе гэта ісціна і ўвасабляецца» [9, с.79].

М. Бярдзяеў пры аналізе гісторыі Расіі сцвярджаў, што, нягледзячы на рэвалюцыйныя змены, Расія застаецца краінай без «асабістага калектыву». Ідэя асобаснага індывідуалізму непарыўна звязана з ідэяй народнасці. Для яго асоба — канцэнтрацыя народнага духу, а сам народны дух — не ўяўляецца без развіцця духоўнасці асобы. Такім чынам, індывідуалізм у трактоўцы Бярдзяева набывае іншае аксіялагічнае гучанне. З аднаго боку — асоба, з іншага — народнасць.

Своеасаблівую пазіцыю ў адносінах да разгляду каштоўнасцей вылучае В. Зяньkoўскі ў працы «Гісторыя рускай філасофіі», дзе развівае ідэю аб узаемасувязі асобы з грамадствам. Вітаючы асобу, яе свабоду, вольнае творчае развіццё, ён падкрэслівае ролю асобы ў гісторыі, але ў той жа час ён не мысліў асобу асобна ад калектыву, грамадства: вышэйшы пачатак у чалавека фарміруецца дзякуючы сацыяльнаму асяроддзю [4, с. 171]. В. Зяньkoўскі падкрэсліваў, што сацыяльныя зносіны ўключаюць духоўны пачатак, кажучы іначай, не калектыўнасць сама па сабе стварае розум у новых чалавечых істотах, але свет разумнасці захоўваецца і перадаецца праз сацыяльнае асяроддзе. В. Зяньkoўскі надаваў першаснае значэнне гуманізму пры ацэнцы маральнасці асобы. Ён лічыў, што само паняцце гуманізму з'яўляецца высокамаральным паняццем. Пры гэтым маральнасць ён звязваў з асветай народа. У сваім аналізе гісторыі рускай філасофіі ён развіваў думку, што асвета без маральных ідэалаў нясе на сабе атруту [4, с. 106].

Рускія філосафы вылучалі ў якасці аксіялагічнага шэрагу такую важную маральную каштоўнасць, як перакананасць, а з ёй і асобасную самасвядомасць. Так, В. Салаўёў сцвярджае, што ўсё гістарычнае

жыццё народаў вызначаецца перш за ўсё іх асноўнымі светапогляднымі перакананнямі. Ён сцвярджаў, што немагчыма ненатуральна жыць без высокіх духоўных пачатках у разумовай і маральнай пустаце. Са знікненнем глыбокіх перакананняў, усеагульных безумоўных ідэй апусцеў свет унутраны, і згубіў сваю прыгажосць сусвет знешні [9, с. 15—16].

Праблема перакананасці як духоўнай каштоўнасці ў фарміраванні чалавека, асабліва на ранняй ступені яго развіцця, неабходна для выхавання пачуцця доўгу і адказнасці за сябе і іншых. Але і доўг, і адказнасць у поўнай ступені могуць праяўляцца толькі ва ўмовах сапраўднай свабоды асобы. Так, Бярдзяеў падкрэслівае: «Толькі адказны — свабодны, і толькі свабодны — адказны». Ён адзначае, што без вялікай адказнасці не можа ажыццяўляцца развіццё народнага духа. Паўната і шырыня падыходу Бярдзяева да разгляду катэгорыі адказнасці знайшла сваё адлюстраванне ў імкненні трактаваць яе як праяўленне высокага маральнага духу, узвышэнні асобы і іншых маральных паняццяў. Да такога аналізу адказнасці, як дух каштоўнасці, наблізіўся В. Розанаў, які пісаў: «Нельга, з'явіўшыся на зямлі толькі на імгненне, думаць, што зямля належыць нам, і мы можам зрабіць на ёй усё, што хочам» [3, с. 73]. Філосафы выступалі супраць гвалтоўнага навязвання чалавеку любых маральных прынцыпаў, нават калі апошнія з'яўляюцца агульнапрынятымі. С. Гесен у працы «Асновы педагогікі: Уводзіны ў прыкладную філасофію» сцвярджаў, што адукацыя ёсць не што іншае як культура асобы. Таму задача ўсялякай адукацыі — далучэнне чалавека да культурных каштоўнасцей навукі, мастацтва, маральнасці, права, гаспадаркі, ператварэнне прыроднага чалавека ў культурнага [2, с. 33]. Вучоны прапанаваў да метадалагічнай традыцыі кантыянства падысці з пункту гледжання аксіялогіі. Абвяшчаючы першаснасць духоўных каштоўнасцей, каштоўнасцей культуры, Гесен, у рэшце рэшт, разглядаў адукацыю як культуру асобы, як працэс далучэння чалавека да культурных каштоўнасцей навукі, мастацтва.

Такім чынам, гістарычна прызнаная традыцыйнасць і фундаментальная каштоўнасць такога ўзроўню не выключае яе адаптыўнасці да новых сацыяльна-культурных і ідэалагічных умоў, з аднаго боку. З другога боку, не выключае іх арганічнай пераемнай сувязі з гістарычна сфарміраванай сістэмай аксіялагічных прыярытэтаў у сферы культуры і адукацыі.

Літаратура

1. Всемирная философия. XX век / автор-сост. А. П. Андриевский. – Минск : Харвест, 2004. – 831 с.
2. Гессен, С. И. Основы педагогики. Введение в прикладную философию / С. И. Гессен. – М. : Школа-Пресс, 1995. – 448 с.
3. Гісторыя філасофскай і грамадска-палітычнай думкі Беларусі: у 6 т. / Нацыянальная акадэмія навук Беларусі, Інстытут філасофіі / пад рэд. У. М. Конана, В. Б. Евароўскага, С. І. Санько [і інш.]. – Мінск : Беларуская навука, 2010. – Т. 1. – 839 с.
4. Зеньковский, В. В. История русской философии / В. В. Зеньковский. – М. : Раритет: Академ. Проект, 2001. – 880 с.
5. Лаптенок, А. С. Современная нравственная культура / А. С. Лаптенок. – Мінск : Бел. о-во «Знание», 2001. – 37 с.
6. Крукоўскі, М. І. Бляск і трагедыя ідэалу / М. І. Крукоўскі. – Мінск : Бел. кнігазбор, 2004. – 351 с.
7. Крукоўскі, М. І. Філасофія культуры: Уводзіны ў тэарэтычную культуралогію / М. І. Крукоўскі. – Мінск : Універсітэцкае, 2000. – 192 с.
8. Розанов, В. В. Избранное / В. В. Розанов. – Нью-Йорк, 1956.
9. Соловьев, В. С. Собрание сочинений / В. С. Соловьев. – СПб. : Просвещение, 1911–1914.

## ФАЎСЦІЯНА Ў БЕЛАРУСКІМ ПОСТМАДЭРНІСЦКІМ ДЫСКУРСЕ

**Т. С. Супранкова**
Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт,
факультэт сацыякультурных камунікацый,
вул. Курчатава, 5, 220108
Мінск, Рэспубліка Беларусь
e-mail: tatsupr@tut.by

Артыкул прысвечаны аналізу ўплыву топаса фаўсціяны на беларускую культуру канца XX — пачатку XXI стагоддзя. У рабоце робіцца акцэнт на тых творах дадзенага перыяду, якія ўспрынялі топас фаўсціяны і надалі яму адметны нацыянальны і ўніверсальны каларыт. Разглядаецца таксама ўздзеянне фаўсціяны на еўрапейскую і беларускую культуру постмадэрнізму.

*Ключавыя словы*: фаўсціяна; постмадэрнізм; беларуская культура і літаратура.